МІНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ПА АДУКАЦЫІ**

**З А Г А Д**

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ПО ОБРАЗОВАНИЮ**

**П Р И К А З**

«15» жніўня 2019 г. № 393

г. Мінск

г. Минск

Аб зацвярджэнні Палажэнняў

На падставе Палажэння аб галоўным упраўленні па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, зацверджаным рашэннем Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 30.05.2018 № 448,

ЗАГАДВАЮ:

1. Зацвердзіць Палажэнне аб Ганаровай грамаце галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.
2. Зацвердзіць Палажэнне аб аб’яўленні Падзякі начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.
3. Лічыць страціўшымі сілу загады начальніка ўпраўлення адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта ад 24.09.2003 № 254-к, ад 24.10.2003 № 282-к і ад 18.09.2007 № 116-к.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Т.В.Апраніч

Глябовіч 500 42 27

ЗАЦВЕРДЖАНА
загад начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама
«15» 08 № 393

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб Ганаровай грамаце галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта**

1. Ганаровая грамата галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – Ганаровая грамата) з'яўляецца формай маральнага заахвочвання калектываў і работнікаў устаноў адукацыі Мінскай вобласці, работнікаў органаў дзяржаўнага кіравання мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей – дзяржаўныя органы) і іншых арганізацый.

2. Ганаровай граматай узнагароджваюцца за:

дасягненні ў навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці;

поспехі, якія дасягнуты ў арганізацыі адукацыйнага працэсу, фізкультурна-аздараўленчай рабоце, патрыятычным і грамадзянскім выхаванні дзяцей і моладзі ва ўстановах адукацыі і іншых арганізацыях;

распрацоўку навукова-метадычнага забеспячэння адукацыі;

паспяховую працу па ўдасканаленні і ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, аснашчэнні вучэбных кабінетаў, майстэрняў, лабараторый;

поспехі навучэнскай моладзі ў вучэбнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай дзейнасці, а таксама ў тэхнічным, мастацкім, экалагічным, турысцкім напрамках дадатковай адукацыі, удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фестывалях, канферэнцыях, сімпозіумах, кангрэсах, семінарах і іншых адукацыйных мерапрыемствах;

высокія паказчыкі ў працы, паспяховае выкананне задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі;

за высокі ўзровень арганізацыі работы з грамадзянамі;

за высокі ўзровень вытворча-тэхналагічнай, працоўнай і выканаўчай дысцыпліны;

за іншыя заслугі.

3. Ганаровай граматай могуць узнагароджвацца калектывы і работнікі ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці, работнікі дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый іншых ведамстваў, якія на працягу многіх гадоў прымалі актыўны ўдзел у навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення, прафілактычнай рабоце з дзецьмі

і моладдзю, умацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў адукацыі, развіцці сістэмы адукацыі Мінскай вобласці.

4. Узнагароджанным Ганаровай граматай выплачваецца грашовая прэмія ў памеры трох базавых велічынь кожнаму.

Грашовая прэмія выплачваецца за кошт сродкаў, прадугледжаных на прэміраванне работнікаў установы пры наяўнасці эканоміі па фонду аплаты працы.

Работнікам дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый іншых ведамстваў выплачваецца аднаразовая грашовая прэмія за кошт сродкаў арганізацыі, якая хадайнічае аб узнагароджанні.

5. Рашэнне аб узнагароджанні Ганаровай граматай прымаецца начальнікам галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама на падставе хадайніцтва ўпраўленняў па адукацыі райвыканкамаў, упраўленняў (аддзела) па адукацыі, спорце і турызме райгарвыканкамаў, устаноў адукацыі абласнога падпарадкавання, органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый і ўстаноў іншых ведамстваў.

Узнагароджанне Ганаровай граматай можа ініцыяваць начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама.

6. Хадайніцтва прадстаўляецца ў галоўнае ўпраўленне па адукацыі Мінскага аблвыканкама за месяц да ўзнагароджання, якое змяшчае звесткі аб кандыдату для узнагароджання згодна з Дадаткам 1.

7. Хадайніцтва да ўзнагароджання Ганаровай граматай узгадняецца з адпаведнымі структурнымі падраздяленнямі галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама.

8. Узнагароджанне Ганаровай граматай ажыццяўляецца на падставе загада начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама.

9. Паўторнае ўзнагароджанне Ганаровай граматай дапускаецца ў выключных выпадках, але не раней чым праз два гады з дня папярэдняга ўзнагароджання.

10. Ганаровая грамата ўручаецца начальнікам галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама, упаўнаважанымі ім асобамі, кіраўнікамі дзяржаўных органаў і арганізацый.

Ганаровая грамата ўручаецца асабіста работніку ва ўрачыстых абставінах.

Ганаровая грамата ўручаецца калектыву арганізацыі на ўрачыстым сходзе гэтага калектыву.

11. Запіс аб узнагароджанні Ганаровай граматай уносіцца ў працоўную кніжку работніка.

12. Персанальны ўлік работнікаў, якія ўзнагароджаны Ганаровай граматай, вядзецца сектарам арганізацыйна-кадравай работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама і кадравымі службамі ўстаноў і арганізацый.

# ХАДАЙНІЦТВА

## аб узнагароджанні Ганаровай граматай галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (у назоўным і вінавальным склонах)____________________________________________

   ____________________________________________

2. Пасада і месца работы____________________________________________

3. З якога часу працуе на апошняй пасадзе______________________________

4. Стаж педагагічнай работы______________________________

5. Дата нараджэння____________________________________________

6. Якія ўзнагароды мае і дата ўзнагароджання______________________________

   ____________________________________________

   ____________________________________________

7. Кароткая характарыстыка з указаннем заслуг і дасягненняў за апошнія два гады

   ____________________________________________

   ____________________________________________

   ____________________________________________

   ____________________________________________

   ____________________________________________

   ____________________________________________

Кіраўнік арганізацыі ____________________________________________

(пасада, подпіс, ініцыялы, прозвішча)

М.П.

ЗАЦВЕРДЖАНА
загад начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама
«15» 08 № 393

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб аб'яўленні Падзякі начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта**

1. Падзяка начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – Падзяка) - асобая форма ацэнкі і прызнання заслуг і дасягненняў у працоўнай, педагагічнай, навуковай, сацыяльна-культурнай, грамадскай і іншых відах дзейнасці калектываў і работнікаў устаноў адукацыі, органаў дзяржаўнага кіравання мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей – дзяржаўныя органы) і іншых прадпрыемстваў і арганізацый.

2. Падзяка аб'яўляецца за:

дасягненне асабліва высокіх вынікаў у працоўнай дзейнасці;

актыўны ўдзел у перспектыўных праектах, якія накіраваны на вырашэнне эканамічных, сацыяльных праблем і актуальных задач, якія стаяць перад сістэмай адукацыі;

выдатныя дасягненні ў арганізацыі і ўдасканаленні адукацыйнага працэсу, укараненне ў адукацыйны працэс новых тэхналогій навучання, сучасных формаў і метадаў арганізацыі і правядзення заняткаў, поспехі ў распрацоўцы вучэбнай і метадычнай літаратуры;

значны ўклад у развіццё навукі і інавацыйнай дзейнасці;

выкананне асабліва важных даручэнняў кіраўніцтва галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта;

належную арганізацыю работы з грамадзянамі;

забеспячэнне вытворча-тэхналагічнай, выканаўчай і працоўнай дысцыпліны, стварэнне бяспечных умоў адукацыйнага працэсу;

за іншыя заслугі.

3. Падзяка аб'яўляецца па ініцыятыве начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта (далей – начальнік).

Падзяка можа аб'яўляцца па ініцыятыве ўпраўленняў па адукацыі райвыканкамаў, упраўленняў (аддзела) па адукацыі, спорце і турызме райгарвыканкамаў, дзяржаўных органаў і іншых прадпрыемстваў і арганізацый з прадстаўленнем не пазней, чым за 21 каляндарны дзень да ўзнагароджання, хадайніцтва, якое змяшчае звесткі аб кандыдату для узнагароджання згодна з Дадаткам 2.

4. Аб’ява Падзякі ажыццяўляецца на падставе загаду начальніка ва ўрачыстай абстаноўцы начальнікам або ўпаўнаважанай ім асобай і суправаджаецца ўручэннем спецыяльнага ліста аб аб’яўленні Падзякі і аднаразовай грашовай прэміі работнікам устаноў адукацыі Мінскай вобласці ў памеры акладу, дзяржаўным служачым - у памеры 0,5 службовага акладу.

Грашовая прэмія выплачваецца за кошт сродкаў, прадугледжаных на прэміраванне работнікаў установы пры наяўнасці эканоміі па фонду аплаты працы.

Работнікам дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый іншых ведамстваў выплачваецца аднаразовая грашовая прэмія за кошт сродкаў арганізацыі, якая хадайнічае аб узнагароджанні.

5. Працоўным калектывам арганізацый уручаецца толькі ліст аб аб’яўленні Падзякі на ўрачыстым сходзе ці пасяджэнні калектыву.

6. Падзяка з’яўляецца ўзнагародай і адпаведны запіс уносіцца ў працоўную кніжку работніка.

7. Персанальны ўлік работнікаў і калектываў, якім аб’яўлена Падзяка, вядзецца сектарам арганізацыйна-кадравай работы галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама і кадравымі службамі устаноў і арганізацый.

Дадатак 2

# ХАДАЙНІЦТВА

## аб аб'яўленні Падзякі начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку (у назоўным і давальным склонах)______________________________________________
   ______________________________________________________________

2. Пасада і месца работы__________________________________________

3. З якога часу працуе на апошняй пасадзе__________________________

4. Стаж педагагічнай работы______________________________________

5. Дата нараджэння_____________________________________________

6. Якія ўзнагароды мае і дата ўзнагароджання_______________________
   ______________________________________________________________
   ______________________________________________________________

7. Кароткая характарыстыка з указаннем заслуг і дасягненняў за апошнія два гады
   ______________________________________________________________
   ______________________________________________________________
   ______________________________________________________________
   ______________________________________________________________
   ______________________________________________________________
   ______________________________________________________________

Кіраўнік арганізацыі ______________________________________

(пасада, подпіс, ініцыялы, прозвішча)

М.П.